# Прамова таварыша А. Н. АКСЁНАВА

Дарагія таварышы!

Мне выпала прыемная і ганаровая місія — уручыць ардэнаноснаму гораду Віцебску пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Дазвольце ад імя ЦК Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР перадаць вам, а ў вашай асобе ўсім працоўным горада самыя сардэчныя і гарачыя віншаванні з гэтай заслужанай узнагародай, выказаць глыбокую ўдзячнасць за вашу ўдарную працу і пажадаць вялікіх поспехаў у ажыццяўленні велічнай праграмы, намечанай XXV з'ездам КПСС.

Працоўныя Беларусі, як і ўвесь савецкі народ, з велізарным палітычным і працоўным уздымам сустрэлі рашэнні XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Творчы настрой пануе цяпер у кожным працоўным калектыве рэспублікі, з найвялікшай цікавасцю вывучаюцца матэрыялы і дакументы з'езда.

работы партыі, намечана велічная праграма далейшага будаўніцтва камунізму ў СССР.

Да гэтага дакумента, які мае вялікае палітычнае і тэарэтычнае значэнне, яшчэ доўгія гады будуць звяртацца будаўнікі новага грамадства. У ім будуць чэрпаць яны натхненне і яснасць перспектыў, разуменне важнейшых заканамернасцей, шляхоў і сродкаў паспяховага вырашэння вялікіх і складаных задач стварэння новага свету — свету праўды, свету свабоды, свету народнага шчасця.

Ва ўвесь голас прагучала на з'ездзе вернасць нашай партыі сцягу пралетарскага інтэрнацыяналізму, дружбе народаў, барацьбе за мір. XXV з'езд вызначыў новыя задачы КПСС на міжнароднай арэне, якія з'яўляюцца арганічным працягам і развіццём Праграмы міру. Яго рашэнні — гэта праграма далейшай барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва, за свабоду і незалежнасць народаў.

У выступленнях з трыбуны

надзейнага аплоту міру і бяспекі народаў, выражальніка карэнных інтарэсаў і спадзяванняў народных мас.

Няма сумнення ў тым, што ў слаўны летапіс нашай партыі XXV з'езд КПСС увойдзе як з'езд вялікіх здзяйсненняў, які прайшоў пад знакам рэалізму і дзелавітасці, непахіснай упэўненасці ў сваіх сілах, непераможнасці нашай вялікай справы будаўніцтва камунізму, нашай барацьбы за трывалы, справядлівы мір на зямлі.

Камуністы, працоўныя рэспублікі, як і ўвесь савецкі народ, выказваюць свае патрыятычныя пачуцці, любоў і непадзельнае давер'е партыі, поўнае адабрэнне плённай дзейнасці яе Цэнтральнага Камітэта, Палітбюро ЦК на чале з непахісным ленінцам, выдатным палітычным дзеячом нашага часу, нястомным барацьбітом за мір таварышам Л. І. Брэжневым. Усё гэта дае савецкім людзям магутны зарад творчай энергіі і ініцыятывы, магутны імпульс для новых слаўных спраў і здзяйсненняў. Як магутная веснавая паводка разліваецца працоўны энтузіязм савецкага народа, і ў гэты бурны, кіпучы, нястрым-

вынікаў ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана на 1975 год і паспяховае завяршэнне дзевятай пяцігодкі Беларуская ССР у ліку іншых брацкіх рэспублік узнагароджана пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

На высокай хвалі найвялікшага працоўнага ўздыму і энтузіязму вялася падрыхтоўка да XXV з'езда КПСС.

Асабліва прыемна, што кожная вобласць, горад і раён, кожны працоўны калектыў рэспублікі ўнеслі свой канкрэтны ўклад у дастойную сустрэчу партыйнага форума.

Таварышы! ЦК Кампартыі Беларусі і ўрад рэспублікі высока ацэньваюць працоўную самаадданасць і мэтанакіраванасць працоўных горада Віцебска. Для працоўных горада дзевятая пяцігодка была пяцігодкай сапраўды вялікіх здзяйсненняў і падзей. За поспехі, дасягнутыя ў камуністычным будаўніцтве і ў сувязі з 1000-годдзем горад Віцебск у 1974 годзе быў узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Прыемна

тысячы ў 1975 годзе, або больш чым на 60 працэнтаў.

Найбольш значны ўклад у вырашэнне задач павышэння эфектыўнасці вытворчасці за кошт яго тэхнічнага пераўзбраення ўнеслі калектывы вытворча-тэхнічнага аб'яднання «Маналіт», ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга завода заточных станкоў імя XXII з'езда КПСС, заводаў электравымяральных прыбораў, станкабудаўнічых імя Кірава, імя Камінтэрна, камбіната шаўковых тканін, ордэна Леніна фабрыкі «КІМ» і іншыя.

Калектывамі прамысловых прадпрыемстваў праведзена значная работа па павышэнню тэхнічнага ўзроўню, якасці і надзейнасці выпускаемай прадукцыі. За гэты перыяд удастоены дзяржаўнага Знака якасці 118 вырабаў, удзельная вага якіх у атэстуемай прадукцыі ўзрасла з 1,8 працэнта ў пачатку пяцігодкі да 12 працэнтаў у 1975 годзе. На пачатак 1976 года прамысловасць горада выпускала 129 вырабаў са Знакам якасці.

За гады дзевятай пяцігодкі ў горадзе ажыццёўлена вялікая праграма капітальнага будаўніцтва. Усяго пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю

З поўным тэкстам дакумента магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы